CENTRALNA
KOMISJA
EGZAMINACYJNA

Arkusz zawiera informacje prawnie chronione do momentu rozpoczęcia egzaminu.

WYPEŁNIA ZDAJĄCY

KOD

PESEL

*Miejsce na naklejkę.*
*Sprawdź, czy kod na naklejce to* **M-100**.
*Jeżeli tak – przyklej naklejkę.*
*Jeżeli nie – zgłoś to nauczycielowi.*

# EGZAMIN MATURALNY Z JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO

## POZIOM PODSTAWOWY

## ARKUSZ POKAZOWY

TERMIN: **4 marca 2022 r.**
CZAS PRACY: **210 minut**
LICZBA PUNKTÓW DO UZYSKANIA: **50**

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy arkusz egzaminacyjny zawiera 20 stron (zadania 1.–16.). Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Odpowiedzi zapisz w miejscu na to przeznaczonym przy każdym zadaniu.
3. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
4. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
5. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie będą oceniane.
6. Na tej stronie oraz na karcie odpowiedzi wpisz swój numer PESEL i przyklej naklejkę z kodem.
7. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.
8. Możesz korzystać ze słowników językowych.

MMBB-P0-**100**-2203

Układ graficzny
© CKE 2022

## Część 1. Test językowy. Przeczytaj tekst i wykonaj zadania.

Паводле Міланы Трапянок
***“Цягнуць Каляду на дуба”***

Здаўна калядны цыкл складалі тры святы – Раство, стары Новы год і Вадохрышча[1]. Па традыцыі сяляне адзначалі іх сем'ямі, запрашаючы сваякоў і суседзяў на вячэру – куццю. Першая і трэцяя куцця называліся поснымі. А падчас сустрэчы старога Новага года на сталах з'яўлялася і скаромніна[2]. Такая куцця ўжо мела назву багатай.

Паўсюдна калядныя святы заканчваліся на Вадохрышча, а вось у нашым раёне даўняй традыцыяй стала гуляць яшчэ тры дні і завяршаць калядны цыкл 21 студзеня самабытным абрадам “Цягнуць Каляду на дуба”. Ён па крупінках быў адноўлены дырэктарам Новінскага сельскага Дома культуры Нінай Дзмітрыеўнай Клімовіч і ўжо шмат гадоў збірае аматараў нацыянальнага фальклору з усіх куточкаў Беларусі ў вёсцы Новіны.

Тут, зранку 21 студзеня, каля Новінскага сельскага дома культуры сабраўся вялікі натоўп з прыгожа апранутых у нацыянальныя касцюмы дзяцей і дарослых. […]

Куцця – ячная каша ў гліняным гаршку, прыгатаваная да свята Вадохрышча ўжо з 19 студзеня, знаходзілася ў фае Дома культуры. Тут жа дзяўчаты хутка ўпрыгожвалі сноп featрознакаляровымі стужкамі, прывязалі фартух, ставілі яго на кола пад спевы народнага гурта […]. Упрыгожаны сноп разам з куццёй і быў сімвалам народнага свята. Па традыцыі кожны з удзельнікаў абраду мог праверыць свой спрыт у карагодах і гульнях. […]

А на вуліцы ў гэты час стаяць напагатове санкі з сенам, засланыя саматканай посцілкай. Весці Каляду даручаецца самай паважанай вясковай жанчыне. У каторы раз у гэтай адказнай ролі выступае сама Ніна Дзмітрыеўна. […]

Затым урачыстае шэсце на конях накіроўваецца да адзінага дуба ў полі каля вёскі Марціянаўка. На працягу ўсяго шляху мужчыны цягнуць санкі з Калядой, а астатнія спяваюць абрадавыя песні і жартаўлівыя прыпеўкі.

Каля самага дрэва санкі незнарок перакульваюць, і жанчына разам з куццёй трапляе ў снег. Лічыцца, чым больш шчодра рассыпаецца каша з глінянага гаршка на полі, тым больш багаты ўлетку будзе ўраджай. Згодна з традыцыяй, цягнуць Каляду на дуба павінна маладая пара, якая збіраецца на Мясаеда[3] згуляць вяселле. Аднак сёлета адказная і важная справа дасталася дужым, маладым і нежанатым мужчынам, якія ўмацавалі Каляду на разгалінаванні сукоў дуба. […]

“Цягнуць Каляду на дуба” – сімвалічны абрад для нашых продкаў і цяпер ужо непасрэдны гонар бярэзінцаў, якія здолелі, насуперак сучаснаму рытму жыцця, захаваць унікальнае народнае свята, – гаворыць Валянціна Анатольеўна. – Цікавасць да яго не змяншаецца. Вабяць дзяцей і дарослых вясёлы карагод, жартаўлівыя гульні і народныя песні з вялікай надзеяй, “каб наша Каляда к нам на лета прыйшла… нам шчасце і радасць усім прынесла”.

http://belsmi.by

[1] Вадохрышча – адно з царкоўных зімовых свят.
[2] Скаромніна – паводле рэлігійных прадпісанняў, забароненае для яды ў час посту (пра мяса, сала, малако і падобнае).
[3] Мясаед – перыяд пасля Каляд, калі па законе праваслаўнай царквы дазваляецца есці мяса.

**Заданне 1. (0–1)**

***Тлумачальны слоўнік беларускай мовы* падае наступныя значэнні дзеяслова *гуляць*. У якім са значэнняў гэтае слова ўжываецца ў другім абзацы прыведзенага тэксту? Пазнач правільны адказ сярод А–Г.**

**А.** Забаўляцца, пацяшацца (звычайна пра дзяцей).
**Б.** Хадзіць паціху для адпачынку, задавальнення; прагульвацца.
**В.** Пераліваецца рознымі колерамі.
**Г.** Весяліцца (з песнямі, танцамі і пад.).

*Тлумачальны слоўнік беларускай мовы,* пад рэд. Я. Коласа, К. Крапівы, П. Глебкі, Мінск 1977–1984.

**Заданне 2. (0–1)**

**Ці на кожнае пытанне з табліцы можна знайсці адказ у апошнім абзацы тэксту? Пазнач ТАК, калі можна адшукаць адказ, альбо НЕ – калі нельга.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | Чаму сучасныя людзі ахвотна ўдзельнічаюць у даўнім абрадзе? | **ТАК** | **НЕ** |
| **2.** | Якое значэнне маюць абрадавыя карагоды і гульні? | **ТАК** | **НЕ** |
| **3.** | Як мясцовыя жыхары ставяцца да гэтага абраду? | **ТАК** | **НЕ** |

**Заданне 3. (0–1)**

**Якія словы не змяняюцца? Пазнач правільныя адказы сярод А–Г.**

**А.** насуперак
**Б.** незнарок
**В.** вабіць
**Г.** карагод

**Заданне 4. (0–1)**

**Якой формай беларускай мовы напісаны тэкст *“Цягнуць Каляду на дуба”*? Пазнач правільны адказ сярод А–Г.**

**А.** літаратурная
**Б.** дыялектная
**В.** прастамоўе
**Г.** моладзевы слэнг

**Заданне 5. (0–2)**

**Запішы сінонімы да прыведзеных ніжэй слоў.**

даўно – ………………………..…………………………………………………………

прыхільнік – ………………………………………………………………………………

моцны –……………………………………………………………………………………

прыцягваць – ………………………..………………………………………………….

**Заданне 6. (0–3)**

**Напішы рэзюмэ да тэксту *Цягнуць Каляду на дуба* аб'ёмам 40–60 слоў.**

……………………………………………………………………………………………………

……………………………………………………………………………………………………

……………………………………………………………………………………………………

……………………………………………………………………………………………………

……………………………………………………………………………………………………

**Заданне 7. (0–1)**

**Запрапануй і запішы ўласны загаловак да тэксту.**

……………………………………………………………………………………………………

……………………………………………………………………………………………………

……………………………………………………………………………………………………

**Część 2. Test ze znajomości lektur i kontekstów. Wykonaj zadania.**

**Заданне 8. (0–1)**

**Да якога жанру належыць твор Якуба Коласа *Новая зямля*? Пазнач правільны адказ сярод А–Г.**

**А.** апавяданне
**Б.** ода
**В.** паэма
**Г.** трагедыя

**Заданне 9. (0–1)**

**Прачытай прыведзены ніжэй фрагмент *Пінскай шляхты* Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча і на падставе фрагмента і цэлага тэксту ацані праўдзівасць наступных сцверджанняў. Калі сцверджанне праўдзівае, пазнач П, калі не – пазнач Н.**

*Куторга.* Ах, ты, паганец! (Устаючы.) Татарын ты нехрышчоны! Вот збіў мяне, як шведаў Хадкевіч пад Кіргольмам. Пачакай жа, я ж табе не дарую гэтай штукі, − не цяпер, то ў чацвер. (Вітаецца.) Дзень добры, пане Пратасавіцкі! Здарова, пані Пратасавіцкая! (Цалуе яе ў руку.) Відна, відна, − дзякуй богу! Здаровы, як рыжкі баровы... А я к вам з вялікаю навіною. Не ведаеце? Толькі што пан асэсар прыехаў, а такі сярдзіты, не дапускай госпад! Як ліхі татарын. Як толькі ўехаў у ваколіцу ды стаў каля Бэркі, дык зараз і закрычаў − дзясяцкіх, соцкіх! Сабраць усю шляхту да Ціхона Пратасавіцкага, ды каб Іван Цюхай-Ліпскі прыйшоў з сынам туды ж.

*Ціхон.* Хрэн яму ў вочы, − будзе бяда, будзе! Гэты сабака Ліпскі падаў на мяне ў суд, што я яго адлупцаваў, дык вот і асэсара прыслалі. Ну, абдзярэ, як ліпку!

*Куторга.* Вот дзіва, − на тое ён і асэсар! Заўваж толькі − у яго і рукі даўжэй, як у другіх людзей. Ты ведаеш яго прыпавесць: чырвонае − белае ўсё перадзелае.

В. Дунін-Марцінкевіч, *Пінская шляхта*, http://knihi.com

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | У п’есе В. Дуніна-Марцінкевіча высмейваецца фанабэрыстасць мясцовай шляхты. | **П** | **Н** |
| **2.** | У п’есе В. Дуніна-Марцінкевіча высмейваецца гісторыя кахання Грышкі і Марысі. | **П** | **Н** |
| **3.** | П’еса В. Дуніна-Марцінкевіча выкрывае хабарніцтва і амаральнасць царскага суда. | **П** | **Н** |
| **4.** | П’еса В. Дуніна-Марцінкевіча выкрывае хцівасць і неадукаванасць мясцовых сялян. | **П** | **Н** |

**Заданне 10. (0–1)**

**Прачытай пададзены ніжэй фрагмент *Прадмовы да ўсёй Бібліі* Францыска Скарыны і адкажы, з якой падзеяй у гісторыі беларускай кніжнасці звязана гэтая прадмова.**

Біблія – грэчаскае слова, па-руску гэта азначае – кнігі. Так святы апостал Мацвей пачынае Хрыстова дабравесце: "Біблос генезеос Ісусу Хрысту", па-руску гэта значыць "Кніга народзін Ісуса Хрыста". Так з-за іх асаблівай значнасці можаце называць усе кнігі Старога і Новага Запавету, бо поўная Біблія ўсё гэта змяшчае...

Біблія дзецям і людзям простым – кніга для навучання, настаўнікам і людзям мудрым – для захаплення. [...]

Жадаеш ведаць Граматыку, ці, па-нашаму кажучы, грамату, якая вучыць правільна чытаць і гаварыць, – звяртайся да Бібліі. Чытай у ёй кнігу „Псалтыр".

Наважышся асвоіць Логіку, што вучыць пры дапамозе аргументаў адрозніваць праўду ад хлусні, – чытай "Кнігу святога Іова" [...].

У Бібліі – сутнасць сямі навук вызваленых!

Францыск Скарына, *Прадмова да ўсёй Бібліі* [у:] В. Сянкевіч, *Родная літаратура. Падручнік па беларускай літаратурнай і культурнай адукацыі для вучняў 1 класа агульнаадукацыйнага ліцэя*, Беласток 2013, с. 214–218.

…………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………

…………………………………………………………………………………………………

**Заданне 11. (0–1)**

**Прачытай пададзены ніжэй фрагмент *Мужыцкай праўды №1* Кастуся Каліноўскага і на яго прыкладзе дакажы, што *Мужыцкая праўда* належыць да публіцыстыкі. Прывядзі прынамсі два аргументы.**

Дзецюкі!

Мінула ўжэ тое, калі здавалася ўсім, што мужыцкая рука здасца толькі да сахі, – цяпер настаў такі час, што мы самі можам пісаці, і то пісаці такую праўду справядліву, як Бог на небе. О, загрыміць наша праўда і, як маланка, пераляціць па свеце! Няхай пазнаюць, што мы можам не толькі карміць сваім хлебам, но яшчэ і вучыць сваёй мужыцкай праўды. […]

Шэсць лет ужэ мінула, як пачалі гаварыць а свабодзе мужыцкай. Гаварылі, талкавалі і пісалі многа, а нічога не зрабілі. А гэты маніфэст, што цар з сэнатам і з панамі для нас напісаў, то такі дурны, што чорт ведае да чаго ён падобны, – ніякай у нём няма праўды, няма з яго для нас ніякой карысці. Парабілі канцыляры́і, зрабілі суд, як бы гэта не ўсё роўна браць у сраку чы з судом, чы без суда. Парабілі пісараў, пасрэднікаў, а ўсё за мужыцкія грошы, і вялікія грошы – чорт іх ведае на што; для таго хіба, каб запісывалі ў ксёнжкі, як многа напішуць на сраках мужыцкіх. А з гэтага то і відаць, што нам нічога добрага і не думалі зрабіці. […]

Гэту Мужыцкую Праўду напісаў і зноў пісаці будзе Яська-гаспадар з-пад Вільні.

Кастусь Каліноўскі, *Мужыцкая праўда №1*, knihi.com

……………...…………………………………………………………………………………………

………………………………………………………………………………………………………

………………………………………………………………………………………………………

**Заданне 12. (0–1)**

**Прачытай верш Янкі Купалы *Явар і каліна*. Растлумач, што абазначаюць алегарычныя вобразы явара і каліны.**

Песняй вясны лебядзінаю,
Скінуўшы зімнія чары,
Шэпчуцца явар з калінаю
Ў сумнай даліне над ярам.

Лісцікі зеленяй хваляцца
Небу панятлівай мовай:
Росамі мыюцца раніцай,
Песцяцца сонцам паўднёвым.

Захадам модлы пакорныя
З маткай-зямлёй адпраўляюць;
Тайна у ночаньку чорную
Месяца, зор выглядаюць.

Слухаюць смехаў русалчыных,
Лопату крылляў начніцы,
Ветру павеваў ап'янчаных,
Плюскату шклістай крыніцы.

Чуецца музыка дзіўная
У повесцях сонных імшараў...
Цешыцца явар з калінаю,
Скінуўшы зімнія чары.

Янка Купала, *Явар і каліна*, knihi.com

……………...…………………………………………………………………………………………

………………………………………………………………………………………………………

………………………………………………………………………………………………………

**Заданне 13. (0–2)**

**Ці мае верш Янкі Купалы *Явар і каліна* рысы паэтыкі рамантызму? Абгрунтуй свой адказ двума аргументамі.**

……………………………………………………………………………………………………

……………………………………………………………………………………………………

……………………………………………………………………………………………………

**Заданне 14. (0–1)**

**Прачытай фрагмент апавядання Яна Скрыгана *Слепата*. Растлумач, пра якую слепату гаворыць апавядальнік.**

У прыморскім санаторыі на Каўказе за адным сталом са мною абедала маладая жанчына Вера. Я знаў, што яна піяністка, што адпачывала пасля гастрольных падарожжаў, і глыбока-трывожна паважаў яе. […]

Калега без ніякае прычыны сказаў:

– А слаўная жанчына твая суседка.

– Вера? – папытаўся я.

– Але. Толькі шкода, што ў яе гэтак з вокам. Такая прыгожая і – няшчасны чалавек.

– А што ў яе з вокам? – здзівіўся я.

– Яно пакалечана. Хіба ты не бачыў, што калі яна глядзіць, то трошкі прыжмурваецца, каб роўныя былі павекі? І заўсёды стаіць трошкі бокам, каб не відно было калецтва: не хоча паказаць скроні.

– Гэта не ў Веры! – рэзка не згадзіўся я. – Можа, ты думаеш пра каго другога?

– Як? Хіба ты дасюль і не бачыў? – весела зарагатаў мой калега і пачаў пацяшацца з мае няўважлівасці. […]

Сустрэўшыся з Вераю, я знарок пільна ўгледзеўся ў твар. […] Ад куточка вока, там, дзе кладзецца першая маршчынка мудрае чалавечае сталасці, як след выкручастай, ядавіта-шпаркай змейкі, цягнуўся тоненькі шрам, хаваючыся пад лёгкай кудзеркай на скроні, – след дотыку смерці, след вайны.

Нешта чыстае, высокае і святое кранулася мяне. Самая харошая, харашэй за ўсіх на свеце была гэтая жанчына.

І пасля, калі б я ні сустракаўся з Вераю, перада мною міжволі ўсплываў твар калегі, і мне здавалася, што вочы яго засцілае страшная чалавечая слепата.

Я. Скрыган, *Слепата*, [у:] В. Сянкевіч, *Родная літаратура. Падручнік па беларускай літаратурнай і культурнай адукацыі для вучняў 1 класа агульнаадукацыйнага ліцэя*, Białystok 2013, с. 82–83.

……………………………………………………………………………………………………

……………………………………………………………………………………………………

……………………………………………………………………………………………………

……………………………………………………………………………………………………

**Заданне 15. (0–2)**

**Давядзі, што апавяданне Яна Скрыгана *Слепата* належыць да рэалізму. Прывядзі два аргументы.**

……………...………………………………………………………………………………………

……………………………………………………………………………………………………

……………………………………………………………………………………………………

## Część 3. Wypracowanie

**Заданне 16. (0–30)**

Выберы **адну** з прыведзеных ніжэй тэм і напішы сачыненне.

- У сачыненні паразважай над **праблемай**, зададзенай у тэме. Выкладзі **сваю думку** і **абгрунтуй** яе.
- У развагах прадстаў **аргументы**, спасылаючыся на **літаратурны твор**, згаданы ў тэме, і на **іншы твор беларускай літаратуры**.
- Твая праца павінна складацца не менш чым з **250 слоў**.
- Нумар выбранай тэмы ўпішы ў рамку.
- Запішы сачыненне ў адпаведным месцы. Не пішы на палях.

**Тэма 1.**

**Ці сапраўды любоў – галоўная сіла свету? Паразважай над пытаннем на падставе верша Яўгеніі Янішчыц *Ты пакліч мяне. Пазаві…* і выбранага твора беларускай літаратуры.**

Яўгенія Янішчыц

***Ты пакліч мяне. Пазаві...***

Ты пакліч мяне. Пазаві.
Там заблудзімся ў хмельных травах.
Пачынаецца ўсё з любві,
Нават самая простая ява.
І тады душой не крыві
На дарозе жыцця шырокай.
Пачынаецца ўсё з любві –
Першы поспех і першыя крокі.
Прыручаюцца салаўі,
І змяняюцца краявіды
Пачынаецца ўсё з любві –
Нават ненавісць і агіда...
Ты пакліч мяне. Пазаві.
Сто дарог за маімі плячыма.
Пачынаецца ўсё з любві.
А інакш і жыць немагчыма.

Я. Карчэўскі, *Родная літаратура. Падручнік па беларускай літаратурнай і культурнай адукацыі для вучняў 3 класа агульнаадукацыйнага ліцэя*, Białystok 2019, с. 124.

**Тэма 2.**
**Шчасце не мае сваёй асобнай меркі для ўсіх людзей на свеце. Ці згаджаешся са сцверджаннем Змітрака Бядулі? У адказе спашліся на апавяданне Змітрака Бядулі *Пяць лыжак заціркі* і выбраны твор беларускай літаратуры.**

**WYPRACOWANIE**

**na temat nr** ☐

| Miejsce dla egzaminatora |
|---|

**Tabele wypełnia egzaminator!**

| | | | |
|---|---|---|---|
| **1.** | **Spełnienie formalnych warunków polecenia** | **1** | **0** |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **2.** | **Kompetencje literackie i kulturowe** | 0 – 1 – 2 – 3 – 4 – 5 – 6 – 7 – 8 – 9 – 10 – 11 – 12 | liczba błędów rzeczowych | **Ogółem KLiK** |
| | | | | |

**3. Kompozycja wypowiedzi**

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3a | Struktura wypowiedzi | **3** | **2** | | **1** | | **0** | |
| | | A | B | D | C | E | F | G |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 3b | Spójność wypowiedzi | **3** | **2** | **1** | **0** |

| |
|---|
| |
| liczba błędów w spójności |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 3c | Styl wypowiedzi | **1** | **0** |

**4. Język wypowiedzi**

| | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 4a | Zakres i poprawność środków językowych | 6 | | 5 | | | 4 | | | 3 | | | 2 | | | 1 | | | 0 | | | | | |
| | | 1 B | 2 A | 1 C | 2 B | 3 A | 1 D | 2 C | 3 B | 1 E | 2 D | 3 C | 1 F | 2 E | 3 D | 1 G | 2 F | 3 E | 1 H | 2 G | 2 H | 3 F | 3 G | 3 H |

| |
|---|
| |
| liczba błędów językowych |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 4b | Poprawność ortograficzna | **2** | **1** | **0** |

| |
|---|
| |
| liczba błędów ortograficznych |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 4c | Poprawność interpunkcyjna | **2** | **1** | **0** |

| |
|---|
| |
| liczba błędów interpunkcyjnych |

| | |
|---|---|
| **Suma punktów** | |

## BRUDNOPIS *(nie podlega ocenie)*